

## Да 120-годдзя з дня нараджэння Іосіфа Бенцыянавіча Сіманоўскага

Аддзел беларускай і краязнаўчай літаратуры прадстаўляе **кніжную выставу "Да 120-годдзя з дня нараджэння Іосіфа Бенцыянавіча Сіманоўскага — першага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі"**.
І.Б. Сіманоўскі нарадзіўся 24 красавіка 1892 г. у Бабруйску. Атрымаў вышэйшую адукацыю ў Бернскім універсітэце ў Швейцарыі. З 1921 г. узначальваў бібліятэку БДУ (рэарганізавана ў Дзяржаўную бібліятэку імя У.І. Леніна (1922), а затым — Нацыянальную бібліятэку Беларусі (1991).
І.Б. Сіманоўскі — ініцыятар адкрыцця Кніжнай палаты БССР, стварэння ў 1926—1933 гг. абласных бібліятэк у Віцебску, Гомеле, Магілёве, з'яўляецца аўтарам шматлікіх прац па бібліятэказнаўству і бібліяграфіі. За плённую шматгадовую дзейнасць быў удастоены звання заслужанага дзеяча культуры БССР.
Імя І.Б. Сіманоўскага шырока вядома не толькі ў галіне бібліятэказнаўства, але і ў літаратурным асяроддзі, як перакладчыка: упершыню ў Беларусі ён пераклаў творы Э. Верхарна, Г. Гейнэ; вельмі ўдалымі лічаць яго пераклады "Крымскіх санетаў" А. Міцкевіча.
На выставе прадстаўлены творы І.Б. Сіманоўскага, у тым ліку яго пераклады твораў Г. Гейнэ і А. Міцкевіча, літаратура аб жыцці і дзейнасці навукоўца, ўспаміны калег.

***Выстава дзейнічае да 24 мая бягучага года***